ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
1 ЛЮТАГА 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 3 (15834)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

## Валянціна ГАРЦУЕВА:

# «З ДЗЯЦІНСТВА ВЕДАЛА: БУДУ АКТРЫСАЙ»



**Прыма Купалаўскага тэатра Валянціна Гарцуева ўжо на працягу дзесяцігоддзя іграе вядучыя ролі ў спектаклях, а таксама знялася ў дзясятках фільмаў. Актрыса расказала, як знакамітае прозвішча можа ўскладніць жыццё, а таксама падзялілася прафесійнымі і асабістымі планамі.**

***— Валянціна, сёння, напэўна, не ўсе гледачы ў тэатры ведаюць, што вы — прадстаўніца адной з самых знакамітых тэатральных дынастый...***

— Свайго прадзеда, Глеба Паўлавіча Глебава, які стаў акцёрам Купалаўскага тэатра ў 20-х гадах мінулага стагоддзя, я ведаю толькі па аповедах, кнігах, відэаспектаклях. Яго малодшая дачка і мая бабуля Вольга Глебаўна, выдатная піяністка, канцэртмайстар, была цудоўным чалавекам і для мяне вельмі шмат зрабіла. Калі я нарадзілася, мае бацькі, маладыя акцёры, мелі шмат работы ў тэатры. І бабуля рабіла ўсё, каб са мной займацца. Яна, напрыклад, вадзіла мяне «на музыку». Мне падабаліся духавыя музычныя інструменты. І я вырашыла, што хачу іграць на флейце. Праўда, музычную школу я так і не скончыла...

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

*Свой выбар*

# ВАРТАВЫ ПРЫРОДЫ




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Днямі Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь адзначыла юбілей — 15 гадоў. Штодзень яе работнікі стаяць на варце прыроды. Сярод дзяржінспектараў хапае маладых: кожны шосты — ва ўзросце да 30 гадоў. З адным з іх, Іванам РАДЗЕВІЧАМ, мы і адправіліся ў рэйд.**

## У РЭЙД — НА ДВОЕ СУТАК

...Дзевяць раніцы. На месцы сустрэчы чамусьці шукаю вачыма старэнькі УАЗік. Але замест яго нас з фатографам падбірае пікап японскай маркі. Нечакана.

— Аўтапарк абнавілі. «Буханак» ужо практычна не засталося: для пагоняў за браканьерамі, якія раз'язджаюць на джыпах, гэта не самая прыдатная машына, — тлумачыць старшы дзяржінспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Іван Радзевіч, а мы заскокваем у пікап.

У дарозе 23-гадовы хлопец расказвае пра сябе. Па адукацыі ён юрыст: скончыў Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО». Пасля працаваў судовым выканаўцам. У той прафесіі, заўважае Іван, можна атрымаць шмат юрыдычнага вопыту. Але большую частку часу аднімалі не абходы даўжнікоў, а папяровая работа. Сядзець у кабінеце хлопцу не хацелася. Таму праз тры месяцы ён звольніўся і, калі ўбачыў вакансію дзяржінспектара, якая абяцала шмат руху і прыгод, вырашыў паспрабаваць сябе ў новай прафесіі.

Спачатку — стажыроўка. Месяц Іван ездзіў у рэйды ў якасці грамадскага інспектара. Пасля трапіў у штат. Па заканчэнні выпрабавальнага тэрміну хлопца чакаў экзамен. Для гэтай работы трэба ведаць заканадаўства ў сферы аховы прыроды і быць фізічна падрыхтаваным. З апошнім у Івана праблем няма: у школьныя гады ён займаўся веславаннем і мае званне кандыдата ў майстры спорту.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

*Даверальная размова*

# ІНТЫМНЫ ПРАБЕЛ

## Як яго правільна запоўніць падлетку

**Кожны год у Беларусі каля тысячы дзяўчат становяцца мамамі да паўналецця. Ці можа сексуальная асвета вырашыць гэтую праблему? У краіне ёй пакуль займаюцца хутчэй факультатыўна, чым у абавязковым парадку. Бацькі часцяком перакладаюць няёмкія размовы на школу, школа — на бацькоў, а самі падлеткі тым часам шукаюць патрэбную інфармацыю ў інтэрнэце, якія не заўсёды дае дакладныя звесткі.**

Практыка паказвае, што змагацца з падлеткавымі цяжарнасцямі, палавымі захворваннямі і яшчэ мноствам праблем пераходнага ўзросту рэальна дапамагае толькі інфармаванне. Ім якраз і займаецца наша суразмоўніца — **урач-валеолаг Рэспубліканскага інфармацыйна-метадычнага рэсурснага цэнтра «Ювентус» Інэса ПАЛАЗНІК.** Калі сваімі словамі, яна — спецыяліст па здаровым ладзе жыцця, займаецца не толькі пытаннямі фізічнай актыўнасці, правільнага харчавання і шкодных звычак. Падлеткавы валеолаг і пра дэпрэсію пагаворыць, і пра анарэксію, і карыстацца індывідуальнымі сродкамі засцярогі ад інфекцый навучыць.

«Цэнтры, дружалюбныя падлеткам», дзе працуюць такія спецыялісты, з'явіліся па ўсёй Беларусі і ў суседніх краінах пры падтрымцы ЮНІСЕФ. Галоўная іх мэта — дапамагчы маладым людзям захаваць здароўе і вырашыць праблемы, з якімі не пойдзеш ні да настаўнікаў, ні да бацькоў. Зараз у краіне 50 такіх цэнтраў, з іх 8 — у сталіцы. Прыйсці туды па дапамогу можна ў любы момант, але пакуль пра гэтую магчымасць ведаюць не ўсе падлеткі. А з тых, хто ведае, далёка не кожны наважваецца шчыра выказаць пытанні і думкі.

У «Ювентусе» дапамагаюць дзецям яшчэ і педыятр, і нарколаг, і гінеколаг з псіхолагам. Да апошняга спецыяліста старшакласніцы, па словах Інэсы Палазнік, могуць прыходзіць пагаварыць хоць пяць разоў на дзень. Але іх не так шмат, як магло б быць, бо нават проста расказаць падлеткам пра існаванне такіх цэнтраў, як «Ювентус», згаджаецца далёка не кожная школьная адміністрацыя. А абавязковай «праграмы палавой адукацыі» ў Беларусі ўсё яшчэ няма.



— Мы можам толькі запрасіць падлеткаў на гасцявы ўрок, — тлумачыць валеолаг. — Кожны год, кожны квартал адсылаем запыты, каб па школах і каледжах распаўсюдзілі інфармацыю пра цэнтр, запрашаем на лекцыі і семінары. Стараемся, каб першы ўрок палавога выхавання быў не ў школе, а тут, і як мага раней — у 11 гадоў. Па статыстыцы нашага цэнтра, у дзяўчат уступленне ў палавое жыццё можа адбыцца ўжо ў 13 гадоў. А мамам казаць пра гэта яны баяцца і саромеюцца.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*